# XVII З'ЕЗД КП(б) БЕЛАРУСІ

## *Ранішняе пасяджэнне 11 чэрвеня*

Ранішняе пасяджэнне XVII з'езда КП(б)Б адкрыў тав. Левіцкі. Ён прадаставіў слова выконваючаму абавязкі сакратара ЦК КП(б)Б тав. Волкаву для працягу справаздачы аб рабоце ЦК КП(б)Б. Справаздача заняла ўсё ранішняе пасяджэнне з'езда.

# Справаздача тав. А. А. ВОЛКАВА

У першай частцы свайго даклада тав. Волкаў падрабязна спыніўся на вялікай рабоце, праведзенай КП(б)Б у справе выкрыцця і разгрому трацкісцка-бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх шпіёнаў, агентаў замежных разведак, якія прабраліся да кіраўніцтва ў партыйны апарат рэспубліканскі і нізавы, у совецкія і гаспадарчыя арганізацыі.

— Толькі дзякуючы дапамозе ЦК ВКП(б) і асабіста таварыша Сталіна, — гаворыць тав. Волкаў, — нам удалося разграміць асіныя гнёзды ворагаў. Мы абавязаны зрабіць для сябе неабходныя вывады ў сваёй далейшай рабоце. Ні на мінуту не аслабляць, а ўсямерна павышаць бальшэвіцкую пільнасць, рашуча прадаўжаць работу па канчатковаму выкарчоўванню варожага ахвосця.

Партыйная арганізацыя Беларусі правяла немалую работу ў справе барацьбы за ліквідацыю вынікаў шкодніцтва як у народнай гаспадарцы, так і ў партыйнай рабоце. Для гэтага ў першую чаргу неабходна было вылучыць новыя кадры работнікаў, беззаветна адданых справе партыі Леніна — Сталіна, правераных на практычнай рабоце. Тав. Волкаў прыводзіць лічбы вылучаных за апошні год партыйных і непартыйных бальшэвікоў на розную кіруючую работу. Каля 500 чалавек вылучана на кіруючую раённую, гарадскую і абласную партыйную работу. 60,5 проц. з іх — беларусы. Пасля ўказання ЦК ВКП(б) у Беларусі сталі больш смела вылучаць на кіруючую работу беспартыйных таварышоў, якіх вылучана на розную работу, у тым ліку раённую і абласную, больш 1300 чалавек.

Тав. Волкаў радам фактаў паказвае, як многія нізавыя работнікі, вылучаныя на адказную рэспубліканскую работу, паспяхова спраўляюцца з ёю. Задачы партыйных арганізацый заключаюцца ў тым, каб усямерна дапамагаць маладым кадрам авалодваць бальшэвізмам, авалодваць сваёй справай. Трэба яшчэ больш смела вылучаць маладых работнікаў, партыйных і непартыйных, больш настойліва вырошчваць і вылучаць мясцовыя беларускія кадры. Неабходна дабіцца пералому ў справе вылучэння на кіруючую работу жанчын.

Тав. Волкаў расказвае з'езду, як ворагі народа ў правакацыйных мэтах выключалі з партыі чэсных камуністаў, усімі мерамі захоўваючы свае кадры. Пры ажыццяўленні рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б) ЦК КП(б)Б дапусціў рад сур'ёзных памылак, аб чым зусім правільна папярэдзіў нас ЦК ВКП(б). Рэзкая крытыка з боку сталінскага ЦК ВКП(б) дапамагла нам выправіць дапушчаныя памылкі. Была адноўлена ў партыі значная колькасць чэсных рады партыі ніводнага чалавека. Партыйныя арганізацыі і аддзел кіруючых парторганаў ЦК КП(б)Б дапускаюць валакіту і бюракратызм у справе афармлення і выдачы партыйных дакументаў новапрынятым і адноўленым у радах партыі.

Дакладчык удзяляе значную ўвагу пытанню становішча камсамольскай арганізацыі Беларусі. Ворагі народа, якія арудвалі ў кіраўніцтве ЛКСМБ, многа нашкодзілі. Тав. Волкаў завастрае ўвагу з'езда на неабходнасці ўзмацнення партыйнага кіраўніцтва камсамолам, уцягнення ў рады КП(б)Б лепшых, перадавых, правераных камсамольцаў.

Гаворачы аб становішчы партыйнай прапаганды і агітацыі, тав. Волкаў адзначае рад сур'ёзных недахопаў на гэтым важнейшым участку партыйнай работы. Той факт, што каля 5 тысяч камуністаў не ахоплены партыйнай вучобай, сведчыць аб тым, што абкомы, гаркомы, райкомы і аддзел партыйнай прапаганды і агітацыі ЦК КП(б)Б сур'ёзна яшчэ не ўзяліся за гэту работу.

Прайшоўшыя выбары ў Вярхоўны Совет СССР узнялі на небывалую вышыню справу бальшэвіцкай агітацыі, але і тут ёсць яшчэ многа недахопаў, асабліва ў пытанні якасці агітацыі. Мы абавязаны па-баявому разгарнуць агітацыйна-прапагандысцкую работу сярод выбаршчыкаў, правесці ўзорна, на асабліва высокім ідэйным узроўні выбары ў Вярхоўны Совет БССР.

Указваючы на тую выключную ўвагу, якую таварыш Сталін аддае бальшэвіцкаму друку, дакладчык падвяргае рэзкай крытыцы работу аддзела друку ЦК КП(б)Б, гаркомаў і райкомаў за нездавальняючую работу па падбору газетных кадраў, за слабае кіраўніцтва газетамі. 36 раённых газет не маюць адказных рэдактараў, на старонках нашых газет слаба асвятляецца партыйнае жыццё. Нездавальняюча сувязь газет з шырокімі масамі.

Тав. Волкаў пераходзіць да пытання аб рабоце прамысловасці БССР. Ён адзначае вялікія дасягненні БССР у справе развіцця прамысловасці. Гэтыя дасягненні маглі-б быць значна большымі. Сур'ёзную шкоду нанеслі соцыялістычнай прамысловасці подлыя фашысцкія бандыты, якія арудвалі на гэтым участку, асабліва па лініі электраснабжэння і апалавай базы. Дакладчык указвае, што да гэтага часу наркаматы марудна ліквідуюць вынікі шкодніцтва.

Асабліва дрэнна працуе наркамат лясной прамысловасці. Зусім недастаткова займаюцца пытаннямі вытворчай работы нашы прафсаюзы, якія не ўзначалілі стаханаўскі рух. Рэзкай крытыцы падвяргае тав. Волкаў работу наркаматаў харчовай прамысловасці, гандлю, фінансаў. Ён ставіць перад партыйнымі арганізацыямі рад канкрэтных задач

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы